жим доступа: http://149.202.74.60/news/culture-art/2017/12/12/1777932. — Дата доступа: 01.03.2020.

3. Ид, М. «Джидда Синема» приветствует новый сезон новыми шоу с арабскими и международными фильмами/Мохаммед Ид. — [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://alreyadanews.com/ksa-news/سينما-جدة-تستقبل-موسم-جديد-بعروض-جديدة-وأفلام-عربية-وعالمية/. — Дата доступа: 01.03.2020.

4. Аль-Дхойи, Х. Искусство актерского мастерства … от таланта и хобби до героизма и профессионализма/Хаммуд Аль-Дхойи. — [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.alriyadh.com/1745148. — Дата доступа: 01.03.2020.

5. Фильм «Менахи» возвращает саудовцев в кино после десятилетий пауз. — [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.bbc.com/arabic/artandculture/2009/06/090625_me_saudi_film_tc2. — Дата доступа: 01.03.2020.

6. Аш-Шафии, М. Саудовский режиссер Амин стал свидетелем Награды Вероны на кинофестивале в Венеции/Моатаз аш-Шафии. — [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.sayidaty.net/node/947791/فن-ومشاهير/أخبار-المشاهير/المخرجة-السعودية-شهد-أمين-تحصد-جائزة-فيرونا-في-مهرجان-البندقية#photo/1. — Дата доступа: 01.03.2020.

7. Эль-Сайед, Х. Р. Волшебный фонарь/Халед Раби Эль-Сайед. — Саудовская Аравия: Арабская диффузная компания, 2008. — 322 с.

*Бабко А. І.*
*БДУКМ, Мінск*

# АСНОЎНЫЯ СТРАТЭГІІ ФІЛАСОФСКІХ ПОШУКАЎ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗНАСТАЙНАСЦІ СУЧАСНЫХ КУЛЬТУРАТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАЎ

Няспыннае ўзмацненне разнастайнасці культуратворчых практык, пошукаў, стратэгій належыць да найгрунтоўнейшых характарыстык сучаснай культурнай сітуацыі. Тэрмін “сучасны” абазначае тут дваццатае і пачатак дваццаць першага стагоддзя (у філасофскай літаратуры ёсць прэцэдэнты такога яго ўжывання [4, с. 73], калі мае месца абстрагаванне ад спецыфічнай семантыкі тэрміна “мадэрн” і не артыкулююцца адрозненні паміж мадэрнам і постмадэрнам, да якіх зараз варта, напэўна, дадаць яшчэ і постпостмадэрн.) З асаблівай інтэнсіўнасцю адпаведныя працэсы працякаюць у такіх галінах культуры, як філасофія і мастацтва. Яны назіраюцца, аднак, нават у сферы навукі — насуперак істотным чынам характэрнай для яе тэндэнцыі да ўніфікацыі, да распрацоўкі грунтоўных сінтэтычных тэорый, праз якія момант разнастайнасці ўтаймоўваецца і падпарадкоўваецца моманту адзінства.

Сучаснае філасофскае мысленне ўвасабляецца ў безлічы дысцыплінарных і тэматычных абсягаў, традыцый і падыходаў. Ніколі дагэтуль яно не было настолькі плюралістычным, “неабсяжным” у сваёй рознасці і разнастайнасці [7, с. 40-41]. У сферы сучаснага мастацтва, як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даводзіць Ганс-Георг Гадамер, індывідуальны аспект творчых практык непадзельна дамінуе над універсальным: мастак імкнецца сёння — калі ўсёабдымная, самавідавочная традыцыя страціла моц — знайсці свой уласны почырк, які быў бы менавіта ягоным, індывідуальным і разам з тым, зразумелым для таго, хто ўспрымае яго творы [4, с.75].

Што да сучаснай навукі, дык нават у фізіцы, у якой (дзякуючы яе засяроджанасці на колькасным аспекце рэчаіснасці, вытлумачанай як прынцыпова аднародная, так што розь насць паміж з'явамі і працэсамі выглядае менавіта як знешняя, колькасная, даступная вымярэнню) адзначаная вышэй тэндэнцыя да ўніфікацыі ведаў заўжды дамінавала, ідэал вялікага і апошняга сінтэзу найгрунтоўнейшых тэорый, які натхняў на інтэнсіўныя даследаванні выдатных фізікаў дваццатага стагоддзя, так і застаўся нязддзейсненым, пакінуўшы дадзеную дысцыпліну ў стане суіснавання прынцыпова адрозных паводле сваіх грунтоўных характарыстык парадыгматычных тэорый. Наяўнасць антыўніфікацыйных тэндэнцый у навуковым пазнанні адлюстроўваецца і ў інспіраваных ім філасофскіх дыскусіях. Фіксацыя і аналіз унутранага плюралізму сучаснай навукі і пэўных яе галін (напрыклад, біялогіі) займае ў згаданых дыскусіях важнае месца [5, с.16-18].

У кантэксце шмат у якіх са сваіх праяў ашаламляльнай разнастайнасці сучасных культуратворчых працэсаў перад філасофіяй паўстае задача яе асэнсавання, ацэнкі і распрацоўкі дзейсных стратэгій уласнага самаразвіцця ў яе ўмовах. Аднак ці правамерна шукаць адказы на пытанні, датычныя плюралістычнага характару сучаснай культурнай сітуацыі ўвогуле? Магчыма, у вылучаных вышэй філасофскай, мастацкай і навуковай галінах культуратворчасці дыверсіфікацыя творчых практык выяўляе розную сутнасць і мае рознае значэнне, не дапускаючы падабенства ў падыходах і ацэнках? Той момант, што мы павінны ўлічваць спецыфіку розных культурных сфер у працэсе аналізу наяўных у іх з'яў, падзей і працэсаў, не выклікае ніякіх сумненняў. Гэта не выключае, аднак, магчымасці абагульненага апісання пэўных сітуацый, што складваюцца ў культуры, творчых практык, што здзяйсняюцца ў ёй, культуры ўвогуле ва ўсёй шматбаковасці яе праяў. Сама канстатацыя той акалічнасці, што ў сучаснай культурнай сітуацыі момант рознасці і разнастайнасці выразна дамінуе над момантам адзінства, выступае як такога кшталту абагульненне і патрабуе далейшай тэарэтычнай працы.

У самым агульным плане з пункту гледжання філасофскага асэнсавання ў найвышэйшай ступені разнастайнага характару сучаснай культурнай сітуацыі магчымыя дзве асноўныя стратэгіі, што грунтуюцца на супрацьлеглых яго ацэнках. Па-першае, згаданая сітуацыя можа быць ацэнена як пажаданы і надзвычай прадуктыўны стан культуры. Адсюль вынікае неабходнасць усебаковага спрыяння працэсам культурнай дыверсіфікацыі ва ўсіх іх творчых праявах. Па-другое, аднак, стан "неагляднай" разнастайнасці можа інтэрпрэтавацца як адзнака глыбокага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крызісу культуры, як вынік дысфункцыі тых яе складнікаў, што адказваюць за працэдуры культуратворчага сінтэзу. У такім выпадку мэтай філасофскіх пошукаў мусіць быць распрацоўка эфектыўных стратэгій супрацьдзеяння звышінтэнсіўнай дыверсіфікацыі культуратворчых практык і актывізацыі адказных за згаданы сінтэз элементаў у будове культуры.

Першая з вышэйназваных стратэгій здзяйсняецца ў пошуках мысляроў, якіх мы называем пстмадэрністамі. Да найважнейшых адзнак гэтай філасофскай плыні належыць імкненне дэстабілізаваць катэгорыю тоеснасці дзеля замацавання ў філасофскім дыскурсе пазіцый катэгорыі рознасці [2]. Час вялікіх расповедаў, асвечаных аўтарытэтам розуму, з гэтага пункту погляду, незваротна мінуў, што ацэньваецца ў найвышэйшай ступені станоўча, бо вялікія філасофскія сістэмы ўяўляюцца прадстаўнікам дадзенага тэарэтычнага кірунку духоўнымі формамі таталітарызму [7, с. 41]. Адсюль вынікае станоўчая рэакцыя на наяўнасць у культурным жыцці мноства разнастайных праектаў як феномен, здольны эфектыўна супрацьстаяць усім і ўсякім праявам дыктату і няволі ў тэарэтычнай і практычнай сферах.

Філасофскае ўхваленне выразнага дамінавання разнастайнасці ў культуры можа быць здзейснена і не ў такой радыкальнай форме, як у абсягу постмадэрнісцкай філасофіі, за якой пагрозліва паўстае небяспечны прывід рэлятывізму. У такім выпадку артыкуляцыя неабходнасці разнастайных культуратворчых практык і ўсебаковага спрыяння ім спалучаецца з прызнаннем іх унутранага адзінства, якое адсоўваецца разам з тым на задні план з пункту гледжання яго ролі і значэння. Падобную пазіцыю ў дачыненні да навуковага сегмента культуры займае сучасны нямецкі філосаф Крысціян Кёхі. Ён рашуча выступае супраць пазітывісцкага ідэалу адзінства навукі, адхіляе ўяўленне аб навуцы-лідары (няхай гэта будзе фізіка ці біялогія), якая ўвасабляе існасць навуковай рацыянальнасці ўзорным чынам. Кожная галіна навуковага пазнання, на яго думку, мае надта спецыфічны характар, каб ёй маглі быць навязаныя стандарты іншай сферы навуковых даследаванняў. Аднак пры гэтым філосаф не адмаўляе існавання характарыстык, уласцівых навуцы як такой, указваючы на абгрунтаваную небяспеку згубіць у рэлятывісцкіх непаразуменнях усякі след аб'ектыўнай навуковай нарматыўнасці ў выпадку татальнага непрызнання агульнанавуковых пазнавальных стандартаў [5, с.15, с.18-19].

Аналагічная сітуацыя мае месца і на другім полюсе (адзначаным прыхільнасцю да ідэалу адзінства культуратвочых працэсаў) указанай вышэй альтэрнатывы: тут таксама выяўляецца магчымасць радыкальнай або памяркоўнай філасофскай стратэгіі. У выпадку першай, "фундаменталісцкай" яе версіі непадзельнае дамінаванне разнастайнасці ў культуры выглядае не інакш, як прыметай яе глыбокага крызісу, які мусіць вырашыцца праз усталяванне новых узораў культуратворчасці, здольных аб'яднаць усе яе праявы. Задача філасофіі ў такіх умовах — усімі наяўнымі ў яе арсенале сродкамі спрыяць пераадоленню гэтай крызіснай сітуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ не так даўно падобная пазіцыя была вызначальнай і ў сферы філасофскіх пошукаў, і ў культурным жыцці ўвогуле на гіганцкіх прасторах былога Савецкага Саюза. Яна грунтавалася на ўяўленні, згодна з якім існуе адзіная праўдзівая філасофія, якая выяўляе інтарэсы найбольш прагрэсіўных сацыяльных сіл і выступае як светапоглядная і метадалагічная аснова для ўсіх культуратворчых практык, у тым ліку навуковых і мастацкіх. Што да апошніх, дык іх азінства замацоўвалася яшчэ і агульным для іх метадам (метадам сацыялістычнага рэалізму), які разглядаўся як найвышэйшае па сваіх эстэтычных характарыстыках увасабленне падставовай структуры мастацкай дзейнасці.

Варта мець на ўвазе, аднак, што радыкальная філасофская артыкуляцыя прынцыпу адзінства культуратворчых практык можа грунтавацца на розных ідэйных падмурках: яе можа сілкаваць, напрыклад, арыентацыя на матэматычныя і прыродазнаўчыя метады і падыходы [7, с. 42]. Як лічыць сучасны французскі філосаф Даніэль Параш'я, усё большая кампактнасць матэматычнай мовы дае магчымасць дакладным і вытанчаным чынам стварыць падставу для таго, каб нанова паставіць грунтоўныя метафізічныя пытанні ў такой плоскасці, якая забяспечвае найлепшыя шанцы знайсці адказы на іх [6, с. 137]. Аднак сітуацыя, што рэальна існуе ў сучаснай культуры, ацэньваецца ім як "паталагічная". Гэтая паталагічнасць выяўляецца ў тым, што чалавецтва не здолела сінтэзаваць розныя ўяўленні ў адзіную кагерэнтную карціну [6, с.1-2]. Тым не менш ужо выспела магчымасць і неабходнасць пераадолець згаданую паталогію. Філасофія, аплодненая ўплывамі і выклікамі з боку навукі, павінна ўзяць на сябе вырашэнне дадзенай задачы [6, с. 5-7].

У дачыненні да згаданай вышэй пазіцыі, характэрнай для савецкага марксізму, патрэбна заўважыць, што яна імкнулася падаць сябе як "дыялектычная", знешне выступаючы за прынцып канкрэтнага, непарыўна знітаванага з рознасцю і супрацьлегласцю адзінства. У культурнай рэальнасці, аднак, дамінавалі таталітарызм, дагматызм і ўніфікацыя, якія спарадычна пераадольваліся выключна дзякуючы каласальным намаганням выдатных дзеячоў культуры. У выпадку адпаведнасці сваёй сутнасці дыялектычная (ці "памяркоўная", як яна была ахарактарызавана вышэй) стратэгія філасофскага асэнсавання разнастайнасці сучасных культуратворчых працэсаў з пазіцыі, у якой сцвярджаецца прыярытэт глыбокага адзіства культуры, вельмі блізкая па сваім характары да памяркоўнай версіі філасофскай стратэгіі, скіраванай на артыкуляцыю моманту рознасці і разнастайнасці згаданых працэсаў (для яе характэрна разам з тым патрабаванне ўліку іх унутранага адзінства). Яны абедзве здольныя паслужыць надзейным падмуркам для філасофскіх пошукаў, што здзяйсняюцца ў кантэксце сучаснай культурнай сітуацыі. Кожная з іх можа мець прыярытэт у даследаванні таго ці іншага сегмента культуры, таго ці іншага яе ўзроўню, таго ці іншага этапу яе самаразвіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнай передумовай эфектыўнай рэалізацыі згаданых стратэгій з'яўляецца яе дыялагічнае напаўненне. Дыялог у сваіх найвышэйшых формах выяўляе арганічнае адзінства тоеснасці і рознасці, ён яднае разнастайнасць пазіцый, поглядаў, аргументацыйных стратэгій праз іх узаемадзеянне, праз іх сутыкненне і ўзаемны ўплыў, праз іх узаемапрыцягненне і нават узаемаадштурхоўванне. Праз дыялагічныя стасункі пераадольваецца і небяспека рэлятывізму, бо сам дыялагічны прынцып набывае моц універсальнага, грунтоўнага, агульнапрызнанага (Карл-Ота Апель даводзіць у дадзенай сувязі пра магчымасць трансцэндэнтальна-прагматычнага абгрунтавання навуковых ведаў і агульнакультурных норм і правіл [3, с. 19]).

Дыялагічныя стратэгіі філасофскіх пошукаў істотным чынам адпавядаюць найбольш эфектыўнай мадэлі культуратворчасці, бо дыялагічныя ўзаемадзеянні культурных традыцый узбагачаюць кожную з іх і культуру ў цэлым. Таму трэба вітаць той факт, што гэтыя стратэгіі выступаюць як шырока запатрабаваныя ў сучаснай філасофіі. У тэорыі камунікатыўнага дзеяння Юргена Хабермаса, у філасофскай герменеўтыцы Ганса-Георга Гадамера, у крытычным рацыяналізме Карла Попера і ў шмат якіх іншых філасофскіх канцэпцыях падкрэсліваецца іх важнасць, тэарэтычная і практычная эфектыўнасць, раскрываецца іх існасць, выяўляюцца звязаныя з іх здзяйсненнем цяжкасці і шукаюцца шляхі пераадолення адпаведных праблем.

Надзвычай важнай передумовай эфектыўнага ўжывання дыялагічнага прынцыпу ў культуры ўвогуле і пэўных яе сегментах з'яўляецца раўнапраўнае становішча ўсіх удзельнікаў камунікатыўных практык. (У дадзенай сувязі істотнае значэнне набывае выразна, рашуча прамоўленая ў беларускай філасофскай культуры забарона на культурнае "месіянства" [1, с. 17-18].) Пры гэтым нас не павінна бянтэжыць тая акалічнасць, што колькасць удзельнікаў вялікага культурнага дыялогу няспынна і імкліва ўзрастае (гаворка, зрэшты, ідзе пра заканамерны, укаранёны ў самой сутнасці сучаснай — інавацыйнай і дынамічнай — культуры працэс). Безумоўна, у такіх абставінах вельмі складана пачуць іншых і быць пачутым самому. Гэта выклік для дыялагічных практык. Пошук адэкватных адказаў на яго спрыяе і дасканаленню дыялагічных зносін, і далейшаму інтэнсіўнаму разгортванню культуратворчых працэсаў.

Такім чынам, найбольш прадуктыўныя механізмы асэнсавання сучаснай — у найвышэйшай ступені плюралістычнай — культурнай сітуацыі маюць не маналагічную, а дыялагічную натуру. Дыялагічная стратэгія павінна быць ацэнена як найбольш плённая і ў кантэксце разгортвання саміх культуратворчых працэсаў. Яна вядзе да арганічнага спалучэння ў гэтых працэсах і моманту іх адзінства, і моманту рознасці, што ўказвае на яе дыялектычны характар. Дыялог і дыялектыка — роднасныя паняцці не толькі ў этымалагічным плане, сінтэз праз дыялог — гэта дыялектычны сінтэз: ён ні ў якім разе не зніжае вартасці і значэння культурнай разнастайнасці. Наадварот, ён спрыяе яе разгортванню і ўсё больш поўнай рэалізацыі яе творчага патэнцыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Спіс літаратуры:**

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду/ І.Абдзіраловіч. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 44 с.
2. Aylesworth, Gary, "Postmodernism", The Stanford Encyclopedia of Philosophy (Spring 2015 Edition), Edward N. Zalta (ed.), URL = <https://plato.stanford.edu/archives/spr2015/entries/postmodernism/>.
3. Apel, K.-O. Begründung/ K.-O. Apel// Handlexikon zur Wissenschaftstheorie/ hrsg. von H. Seiffert und G. Radnitzky. — München: Ehrenwirt, 1989. — P. 14-19.
4. Gadamer, H.-G. Ende der Kunst? Von Hegels Lehre von dem Vergangenheitscharakter der Kunst bis zur Antikunst von heute/ H.-G. Gadamer// Das Erbe Europas/H.-G. Gadamer. — 3. Aufl. — Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1995. — P. 63—86.
5. Köchy, K. Biophilosophie zur Einführung/ K. Köchy. — Hamburg: Junius, 2008.- 237 p.
6. Parrochia, D. Les grandes révolutions scientifiques du XX siècle/ D. Parrochia. — Paris: Presses Universitaires de France, 1997. — 434 p.
7. Wuchterl, K. Gegenwart — Zwanzigstes Jahrhundert/ K. Wuchterl// Handwörterbuch Philosophie/hrsg. von Wulff D. Rehfus. — Göttingen: Vanderhoeck & Ruprecht, 2003. –P. 38-42

*Беседина Е. В.*
*Орловский государственныйо институт культуры,*
*г. Орел (Российская Федерация)*

## ПРОЕКТНЫЙ ПОДХОД В ФОРМИРОВАНИИ ДОСУГОВЫХ ПРЕДПОЧТЕНИЙ РАБОЧЕЙ МОЛОДЕЖИ (ИЗ ПРАКТИКИ РАБОТЫ МБУК «ЦКР «ФОРУМ»)

В современной социокультурной ситуации, обусловленной экономическими переменами в стране, общество претерпевает своеобразную «революцию предпочтений» в культурно-досуговой сфере. Сегодня досуг и отдых рассматриваются как важнейший элемент повседневного времяпровождения, заключающий в себе мощный потенциал культурного развития личности. Это выражается не только в том, что существенно расширяются возможности заполнения своего досуга для большинства населения страны, но, в частности, и в том, что происходят качественные типологические сдвиги по отношению к своему свободному времени и его ценности как таковой [1].

Молодежь как социальная группа, наиболее динамично реагирующая на все то, что не принято считать традиционным и устоявшимся, обнаруживает наибольшую активность в освоении новых возможностей и форм проведения досуга. При этом работающая молодежь обладает свободным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ